БАЦЬКАЎШЧЫНА

ОРГАН БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВОЛЬНАЙ ДУМКІ

WHITERUTHENIAN NEWSPAPER "BACKAUSCYNA" ("FATHERLAND")

Responsible Publisher: Wladimir BORTNIK

Druck: „LOGOS", Buchdruckerei u. Verlag, G.m.b.H. München 8, Rosenheimerstr. 46 a.

Post Adress: "Backauscyna", München 22, Herzog-Rudolf-Straße 49/III
Die Administration der Weißruthenischen Zeitung „BACKAUSCYNA" München 22, Herzog-Rudolf-Straße 49/III

ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ — ЦАНА 30 Н. ФЭН.

DIE WEISSRUTHENISCHE ZEITUNG „DAS VATERLAND" | THE WHITERUTHENIAN NEWSPAPER „THE FATHERLAND" | LE JOURNAL BIELORUSSIEN „LA PATRIE"

№ 40 (119) | Нядзеля 4 кастрычніка 1952 г. | ГОД ВЫДАНЬНЯ 6

Няма супольнай базы

У БЛУДНЫМ КОЛЕ БЯСПЛОДНЫХ ГУТАРАК

Ужо другі год вядуцца намаганьні стварэньня супольнага з расейцамі палітычнага цэнтру змаганьня з бальшавізмам і вынікі гэтае працы бадай што ніякія. Прадстаўнікі як расейскіх, гэтак і нерасейскіх палітычных арганізацыяў, што згадзіліся пайсьці з расейцамі на гэтае супрацоўніцтва, ужо другі год таўкуцца на адным месцы, ніяк ня могучы знайсьці супольнае зь імі мовы. І гэта навет у тым выпадку, што некаторыя з гэтых нерасейскіх арганізацыяў зусім ня выражаюць запраўдных імкненьняў сваіх народаў і ня цешацца шырэйшым падтрыманьнем эміграцыйных грамадзянстваў, зьяўляючыся толькі апартуністычнымі групкамі людзей, што гатовыя на далёка йдучыя кампрамісы і ўступкі на карысьць «старэйшага брата».

У сувязі з гэтым варта паставіць пытаньне, дзе прычыны немагчымасьці дасягнуць паразуменьня з расейцамі й ці супрацоўніцтва зь імі наагул магчымае? Разважыць гэтае пытаньне важна й карысна ня толькі нам, палітычным эмігрантам паняволеных бальшавізмам нерасейскіх народаў, ня толькі навет расейскім эміграцыйным палітыкам, але таксама й тым амэрыканскім колам, якія, за пасярэдніцтвам Амэрыканскага Камітэту Вызваленьня Народаў Расеі, патранующь усей гэтай акцыі палітычнага задзіночаньня. Варта ўсё гэта прааналізаваць і зрабіць вывад, ці далейшая акцыя над палітычным скаардынаваньнем павінна разьвівацца ў тым самым, што і дагэтуль, кірунку, і пры помачы тых самых мэтадаў, ці шукаць іншых, больш рэальных шляхоў, што ўсё-ж такі прывялі-б да супрацоўніцтва і супольнага змаганьня, ці сьцьвердзіўшы безнадзейнасьць такіх намаганьняў, пакінуць іх зусім, як поўнасьцю нярэальныя да зьдзейсьненьня. У апошнім выпадку адзіным тады выхадам было-б мантаваньне двух цэнтраў змаганьня: асобна цэнтру нерасейскіх народаў і асобна расейкага, паралельна аказваючы аднаму й другому палітычнае й матарыяльнае падтрыманьне. Ніжэйшыя разважаньні й памогуць нам прыйсьці да пераканаць, які з гэтых трох праектаў можа быць найлепшым выхадам з заіснаваўшай сытуацыі.

БАЛЬШАВІЗМ У ЗАПРАЎДНАСЬЦІ Й ЯК ЯГО ЎЯЎЛЯЮЦЬ РАСЕЙЦЫ

Усякае міжнацыянальнае й міжнароднае супрацоўніцтва ў тым толькі выпадку можа быць эфэктоўным і плодным, калі яно мае пад сабой супольную палітычную базу. У дадзеным прыпадку, калі ходзіць пра змаганьне з бальшавізмам, гэтая акцыя павінна ў сябе зьмяшчаць два розныя, але й узаемна сябе дапаўняючыя, аспэкты: нэгатыўны — супраць чаго ці каго мы змагаемся, і пазытыўны — за што змагаемся, ці гаворачы канкрэтна, які мае быць зьмест таго новага палітычнага парадку, які мае прыйсьці на зьмену бальшавізму ў СССР.

Ня трэба лішне ламаць галавы над тым, каб сьцьвердзіць, што абодвы гэтыя аспэкты антыбальшавіцкага змаганьня, як нэгатыўны — супраць чаго, гэтак і пазытыўны — за што, у ўяўленьні расейцаў зьяўляюцца зусім рознымі й супярэчнымі тым, якімі яны ёсьць для ўсіх нерасейскіх народаў. Нам адразу могуць закінуць, што нічога падобнага, што нэгатыўная мэта змаганьня ёсьць тая самая, што і мы і расейцы зьяўляемся зацятымі ворагамі бальшавізму й жадаем ягонага зьнішчэньня.

Згода! Але ўся бяда ў тым, што зусім што іншае разумеюць пад бальшавізмам расейцы, а зусім што іншае мы. Для нерасейскіх народаў бальшавізм ці савецкі камунізм, гэта ня толькі рэжым Сталіна й ягоная сыстэма НКВД-МГБ, ня толькі абнаглелы фізычны й маральны тэрор ды жахлівая эксплёатацыя й прыгнечаньне працоўных, але і ўсё тое, на чым базуецца ўся камуністычная сыстэма й з чаго чэрпае свае жыцьцёвыя сілы. Гэтай жыцьцёвай базай савецкага камунізму зьяўляецца містычны расейскі шавінізм і спрадвечны імпэрыялізм, які, як трапна ў сваім часе сьцьвердзіў міністар замежных справаў ЗША Эчысон, мае за сабой 500-гадовую гістарычную традыцыю. Нашая канцэпцыя змаганьня з бальшавізмам уключае ў сябе ня толькі змаганьне із Сталінскім рэжымам, як канкрэтнай праявай расейскага імпэрыялізму, але із самым расейскім імпэрыялізмам і шавіністычнай тэорыяй аб вышэйшасьці й перадавой ролі расейскага народу, якія зьяўляюцца ня толькі складовымі элемэнтамі бальшавізму, але й базай, на якой ён вырас і зь якой чэрпае свае жыцьцёвыя сокі. І Амэрыка і дэмакратычны Захад зусім не змагаюцца сяньня з камуністычнай ідэалёгіяй, як сьветапаглядам, але выключна з камуністычным імпэрыялізмам, незалежна ад таго, якім іменем ён сяньня называецца. Назва не адыгрывае істотнай ролі, а галоўным зьяўляецца зьмест, што ў гэтую назву ўложаны. А што зьмест савецкага імпэрыялізму выключна расейскі, аб гэтым сьветчыць уся гісторыя Расеі, якая з маленькага маскоўскага княства вырасла шляхам ваенных падбояў у найвялікшую ў сьвеце імпэрыю, аб гэтым сьветчыць русыфікатарская палітыка Савецкага Саюзу ня толькі ў ім самым, але й на апанаваных ім тэрыторыях у вапошнюю вайну, сьветчыць аб гэтым напасьледак і дзейнасьць усей расейскай эміграцыі, якая, выступаючы супраць Сталінскага рэжыму ўнутры СССР, фанатычна бароніць усіх імпэрыялістычных дасягненьняў як царскай, гэтак і бальшавіцкай Расеі. Інтэрнацыянальная камуністычная ідэалёгія ў Сталінскай практыцы зьяўляецца запрэжанай на службу таго-ж самага расейскага імпэрыялізму зусім так сама, як у свой час служыла гэтай мэце праваслаўе, ідэя «зьбіраньня рускіх земляў» або панславістычная ідэя задзіночаньня славянства. Прыклад Ціты паказаў, што камунізм, унезалежнены ад імпэрыялістычнай Масквы й ад ягонага нацыянальнага расейскага жарала, не зьяўляецца грозным для вольнага дэмакратычнага сьвету, не перастаўшы быць адначасна камунізмам. Камуністычная Югаславія знайшла супольную базу супрацоўніцтва з Захадам і не праяўляе ніякіх імпэрыялістычных намераў. Дык не ў камунізне, як паглядзе на сьвет і палітычнай сыстэме, крыецца карэнь зла, але ў тым, што ў Савецкім Саюзе ён зьяўляецца пастаўленым на службу расейскага імпэрыялізму, на службу імпэрыялістычнай расейскай місыі «вызваляньня народаў» пад кіраўніцтвам «вялікага», «самага прагрэсыўнага» і «перадавога» расейскага народу.

Гэтак, а ня йначай, мы разумеем зьмест бальшавізму, і супраць такога, а ня іншага, змагаюцца й будуць змагацца паняволеныя ім народы. Тым часам у ўяўленьні расейскіх эміграцыйных палітыкаў бальшавізмам зьяўляецца толькі Сталінскі рэжым, які, апіраючыся на інтэрнацыянальнай камуні-

(Заканчэньне на 2 балоне)

Весткі з шырокага сьвету

Адказ заходніх дзяржаваў на савецкую ноту. Урады Задзіночаных Штатаў Амэрыкі, Вялікабрытаніі й Францыі 23 верасьня адказалі на апошнюю савецкую ноту ў справе Нямеччыны, перададзеную заходнім дзяржавам 23 жнівеня. У ноце заходнія дзяржавы заявілі, што перадумовай стварэньня агульна-нямецкага ўраду й задзіночаньня Нямеччыны павінны быць вольныя выбары ў цэлай Нямеччыне. Міністар замежных справаў ЗША Эчысон у сувязі з гэтым заявіў 24 верасьня: «Яна (нота) зьяўляецца далейшай спробай пераканаць Савецкі Саюз аб канечнасьці разьвязаць праблему, якая зьліквідавала-б цяперашні штучны разьдзел Нямеччыны. Гэтай праблемай і ёсьць правядзеньне вольных выбараў у цэлай Нямеччыне».

Рада Эўропы супраць стратэгіі НАТО. Палітычная Камісыя дарадчага сабраньня Эўрапэйскай Рады ў Штрасбургу зажадала 24 верасьня ад арганізацыі Атлянтычнага пакту, каб яна выразна асьветчыла, што ў выпадку савецкай агрэсыі будзе абараняцца ўся тэрыторыя дзяржаваў — сяброў Атлянтычнага пакту, уключна зь Нямеччынай, усімі сродкамі, якія маюць у сваім распараджэньні збройныя сілы НАТО. Гэтае дамаганьне апіраецца на заяве Галяндыі, падтрыманай нямецкай саюзнай рэспублікай і Даніяй, што стратэгія Атлянтычнага пакту прадбачыць у выпадку савецкай агрэсыі адцягнуць свае войскі з паўночна-заходняй Нямеччыны, Даніі й Галяндыі.

Вашынгтон задаволены з сытуацыі на Далёкім Усходзе. Упяршыню на працягу многіх месяцаў у Вашынгтоне пануе аптымізм із разьвіцьця палітычнай сытуацыі ў Азыі. Амэрыканскі амбасадар у Індыі Чэстр Боўльс у сваім паведамленьні да амэрыканскага міністэрства замежных справаў выказаў думку, што прыцягальная сіла камунізму ў краінах паўдзённай Азыі йдзе на спад, мінуўшы свой кульмінацыйны пункт. Боўльс, якога ў выпадку перамогі дэмакратаў на прэзыдэнцкіх выбарах уважаюць за будучага кіраўніка замежнай палітыкі ЗША, адведаў Бірму, Сыям, Індакітай, Маляйскі паўвостраў і Філіпіны, запэўняе, што сэзонныя работнікі й собсьнікі малых гаспадарак пачалі разумець, што камуністыя зь іхнымі абяцанкамі справядлівай зямельнай рэформы імкнуцца ў запраўднасьці да чагосьці праціলежнага — да арганізацыі калгасаў. Там, дзе пад амэрыканскім ціскам распачаўся справядлівы распадзел зямлі і багацьця краінаў, камуністычныя ўплывы малеюць. Таму важна, каб успомненым краінам давалася ня толькі вайсковая дапамога, але трэба каб Захад устрымліваўся ад «каляніялізму».

Пагроза сьвятой вайны супраць Вялікабрытаніі. Пэрскі рэлігійны правадыр і дэпутат парляманту А. Кашані ў інтэрвью 28 верасьня заявіў, што ён выкліча «сьвятую вайну» супраць Вялікабрытаніі, калі яна не адмовіцца ад гаспадарскіх санкцыяў супраць Пэрсыі. Дамагаючыся ў першую чаргу зарваньня дыпляматычных дачыненьняў зь Вялікабрытаніяй, як першага кроку ў «сьвятой вайне», Кашані заявіў: «Брытанскі імпэрыялізм жадае паняволеньня маей краіны. Калі гэтая бязбожніцкая й няпрыязная пазыцыя ня зьменіцца, мы ня будзем мець іншага шляху, як спыненьне ўсякіх сувязяў зь Вялікабрытаніяй».

Напружаньне ў Эгіпце. Праводжаная ў Эгіпце пад кіраўніцтвам генэрала Наджыба чыстка выклікала ў краіне сур'ёзнае нутранапалітычнае напружаньне. Урадавыя колы зрабілі нядаўна націск на ўплывовага эгіпскага палітыка Мустафу Нагаса, каб гэты апошні ціха адыйшоў ад палітычнага жыцьця й зрокся старшынства партыі Вафду. 74-летні палітык асьветчыў, што за выключэньнем эгіпскага народу «ніякая сіла ў сьвеце» ня зможа яго змусіць пакінуць правадырства партыі Вафду.

Ціта гасьцём Чэрчыля. Міністар замежных справаў Вялікабрытаніі Ідэн перад апушчэньнем Югаславіі, дзе ён каля аднаго тыдня вёў палітычныя гутаркі з дыктатарам Югаславіі Цітам, пацьвердзіў на прэсавай канфэрэнцыі, што Чэрчыль запрасіў Ціту прыбыць у Лёндан і што Ціта прыняў гэтыя запросіны, аднак тэрмін ягонага прыбыцьця яшчэ не ўстаноўлены. Візыта Ціты ў Лёндане будзе ягоным першым загранічным падарожжам ад часу спатканьня із Сталінам у Маскве падчас апошняй вайны. Наагул Ціта далей Вены ня быў яшчэ на Захадзе.

65.000 чалавек ад лютага ўцякло ў заходні Бэрлін. Ад лютага сёлета ўцякло з савецкай зоны Нямеччыны ў заходні Бэрлін 65.000 чалавек. З паміж іх каля 30.000 былі перавезеныя паветранай дарогай у Заходнюю Нямеччыну, 5.000 разьмешчана ў заходнім Бэрліне на падставе закону аб зраўнаньні колькасьці ўцекачоў, а аб лёсе астальных 30.000 уцекачоў яшчэ нічога не пастаноўлена.

Актыўнасьць партызанаў у ваколіцах Берасьця. Нямецкая газэта «Зольдатэнцайтунг» паведаміла, што ў Берасьці стала стаяць гатовыя два рамонтныя цягнікі, бо партызаны ў ваколіцах Берасьця часта перарываюць камунікацыю шляхам узрываў чыгуначных рэяк і мастоў.

«Пераносныя бункеры» на карэйскім фронце. Жаўнеры збройных сілаў Задзіночаных Нацыяў у Карэі падчас атакаў супраць ворага пачалі ўжываць сталёвых «пераносных бункераў». Гэтыя «бункеры», якія важаць толькі 75 фунтаў, жаўнеры нясуць перад сабой. Яны пасьпяхова забясьпечваюць атакуючых перад асколкамі артылерыйскіх набояў.

Цікавае апытаньне. Газэта «Нью Ёрк Гэральд Трыбун» нядаўна правяла апытаньне сярод жыхароў ЗША аб карэйскай вайне. Адказы былі вельмі цікавымі й шмат гаворачымі. На пытаньне, ці трэба выйсьці з карэйскага канфлікту й перадаць гэты край камуністым, адказала 23% запытаных — так. 19% былі пагляду, што ўрад ЗША паступіў правільна ў карэйскай палітыцы, 43% былі за тое, што гэтак і надалей трэба паступаць навет калі-б была заіснавала небясьпека трэйцяй сусьветнай вайны. Другая група пытаньняў адносілася да сяньняшняга палажэньня ў Карэі. За далейшыя перагаворы з камуністымі высказалася 22%, за аддачу Карэі камуністым 13% і 53% высказалася за тое, што камуністых трэба раз назаўсёды выкінуць з Карэі.

Амэрыканскія нэгры. Як падае амэрыканская архіўная служба, 189.000 амэрыканскіх нэграў маюць собскія фармы, якія разам налічваюць 48.000 квадратных кілямэтраў і адказваюць вялічыні тэрыторыі Галяндыі. Пакупная сіла амэрыканскіх нэграў выносіць цяпер 15 мільярдаў даляраў у год. 13 банкаў, 74 крэдытныя задзіночаньні, 20 ашчадных і крэдытных касаў, 204 забясьпячальныя таварыствы, 250.000 гандлёвых прадпрыемстваў знаходзяцца ў выключнай собскасьці нэграў. 800.000 нэграў зьяўляюцца собсьнікамі дамоў. Із 150.000 памешканьняў, якія былі пабудаваныя ў мінулым годзе за публічныя грошы, 50.000 было перадана для карыстаньня нэграм. 7.000 нэграў здабываюць унівэрсытэцкую асьвету ў год, а 70.000 вучацца ў дадзены мамэнт у вышэйшых школах.

Француская падводная лодка з 48 людзьмі затанула. Францускае морскае міністэрства паведаміла 25 верасьня, што француская падводная лодка вадазьмяшчэньнем 1.000 тонаў «Ля Сыбіле», якая брала ўдзел у манэўрах францускае флёты, затанула. У лодцы знаходзіліся 3 ахвіцэры й 45 жаўнераў.

У 12 гадзін цераз Атлянтычны акіян. Амэрыканскі пасажырскі самалёт «Сапэр Сікс Кліпэр» пераляцеў адлегласьць зь Нью Ёрку да Франкфурту бяз прызямленьня ў рэкордным часе: 12 гадзін і 48 мінут з 80 пасажырамі — 75 жанчын і 5 дзяцей амэрыканскіх жаўнераў у Нямеччыне.

Сталінская аднагалосная пастанова

Пазыцыя Айзэнгаўэра аслабілася

Сочачы за перадвыбарнай кампаніяй у ЗША, яшчэ нядаўна можна было ўважаць, што Айзэнгаўэр мае значна болей шансаў быць выбраным за месяц на прэзыдэнта Амэрыкі, чымсьці ягоны дэмакратычны канкурэнт губэрнатар Стывэнсон. Сыстэматычныя ўступкі ЗША на працягу апошніх дваццаці год, асабліва ад часу Ялты, Тэгерану й Патсдаму на карысьць Савецкага Саюзу ў замежнай палітыцы, якія спрычыніліся да павялічэньня ягонай магутнасьці й стварылі загрозу новай сусьветнай вайны, а ў нутранай палітыцы вялікая карупцыя ў адміністрацыйным апараце, былі тымі магутнымі дзейнікамі, якія зьнеахвоцілі вялікую часьць амэрыканскага грамадзянства да ўраду дэмакратычнай партыі й ськівавалі іхныя сымпатыі ў бок рэспубліканцаў і іхнага кандыдата Айзэнгаўэра. Дык і ня дзіва, што ня толькі нэўтральныя амэрыканскія выбіральнікі, але й многія сымпатыкі, сябры і навет палітыкі дэмакратычнай партыі, як прыкладам заўсёды верныя дэмакратам паўдзённыя штаты ЗША, пачалі што раз болей высказвацца ў карысьць Айзэнгаўэра.

Так выглядала сытуацыя яшчэ некалькі тыдняў таму назад. Апошнім аднак часам сытуацыя значна зьмянілася й моцная дагэтуль пазыцыя Айзэнгаўэра выразна пахіснулася на карысьць дэмакратычнага кандыдата на прэзыдэнта ЗША.

Першы балючы ўдар атрымаў Айзэнгаўэр з боку амэрыканскіх работніцкіх колаў. Гэтак 71-ы гадавы кангрэс амэрыканскага задзіночаньня прафэсыянальных саюзаў АФЛ прыгатаваў Айзэнгаўэру вельмі халоднае прыймо й распачаўся ад заклiку, каб задзіночаныя ў ім восем мільёнаў работнікаў аддалі падчас выбараў свае галасы за дэмакратаў. Таксама й другое магутнае задзіночаньне прафэсыянальных саюзаў, ведамае пад назвай СІО, якое налічвае шэсьць мільёнаў сяброў, высказалася ўжо супраць кандыдатуры Айзэнгаўэра. Як ведама, гэтае задзіночаньне дамагаецца адкліканьня закону Тэфта—Гэртлея ў работніцкай справе, а Айзэнгаўэр высказаўся за ўтрыманьнем гэтага закону ў сіле, згаджаючыся толькі на некаторыя ў ім зьмены. Калі і ня ўсе сябры прафсаюзаў пойдуць за выбарнымі лёзунгамі сваіх правадыроў, дык у кажным выпадку Айзэнгаўэр будзе змушаны лічыцца, што галасы многіх работнікаў будуць для яго страчанымі.

Палітычная салідарнасьць генэрала із сваім нядаўным адзіным канкурэнтам сэнатарам Тэфтам таксама не ўважаецца за гарантыю ягонага посьпеху. Тая акалічнасьць, што Айзэнгаўэр мог-бы дзякуючы гэтай салідарнасьці прыхінуцца да правага крыла рэспубліканскай партыі, якое рэпрэзэнтуе сэнатар Тэфт, выклікае ў лібэральных колах рэспубліканцаў паважныя засьцярогі да Айзэнгаўэра. Такія самыя засьцярогі выклікала абяцаньне Айзэнгаўэра падтрымліваць сэнатараў Робэрта Кэрты й Вільяма Джынэра, якія належаць да правага крыла рэспубліканскай партыі. У сувязі з гэтым сэнатар Морзэ, які належыць да лібэральных рэспубліканцаў, публічна асьветчыў, што ён болей ня будзе актыўна выступаць у вабароне Айзэнгаўэра, але будзе падтрымліваць дэмакратычнага кандыдата.

Цяжкім ударам было для Айзэнгаўэра выкарыстаньне ягонымі праціўнікамі факту, што амэрыканскі кандыдат на віцэ-прэзыдэнта, сэнатар Рычард Ніксон, падчас выбарнай кампаніі ў 1950 годзе ўзяў ад прадпрыемцаў свайго штату, Каліфорніі, 18.000 даляраў і выдаў іх, не ападаткаваўшы ў урадзе падаткаў. Гэты закід на столькі быў няпрыемным, што навет падносіліся галасы з дамаганьнямі, каб сэнатар Ніксон зрокся сваей кандыдатуры. Аднак кіраўніцтва рэспубліканскай партыі й сам Айзэнгаўэр яго поўнасьцю зрэгабілітавалі й затрымалі ягоную кандыдатуру. Ня гледзячы аднак на гэта, цяжка ўважаць, каб гэты няпрыемны ўсё-ж такі выпадак прычыніўся да папулярнасьці абодвых кандыдатаў рэспубліканскай партыі.

(Заканчэньне на 2 балонке)

Няма супольнай базы

(Заканчэньне)

стычнай ідэі, ня мае ў сабе нічога нацыянальна расейскага й для расейскага народу зьяуляецца зьявішчам антынародным. Для гэтых расейцаў змаганьне з бальшавізмам непамерна звужаецца толькі да змаганьня із Сталінскай клікай, ёсьць імкненьнем да «палацовага перавароту», каб на месцы Сталінскага палітбюра пасадзіць іншых людзей, але захаваць і надалей адзіную й непадзельную імпэрыю й шавіністычную тэорыю аб вышэйшасьці й кіруючай ролі расейскага народу, што зьяўляецца выходнай базай расейскага імпэрыялізму. Дык зразумела, што мэты змаганьня нерасейскіх народаў і мэты эміграцыйных расейскіх палітыкаў ня толькі крыжуюцца, але ў вельмі вялікай меры таксама й узаемна сябе выключаюць. Паміж бальшавізмам і нерасейскімі народамі абсалютна няма нічога такога, што-бы іх лучыла. Затое некаторыя элемэнты бальшавізму розьняць яго з расейцамі, але некаторыя, і гэтых бадай што большасьць, іх лучаць. Дык якая-ж тады можа быць каардынацыя супольнай антыбальшавіцкай дзейнасьці?

НАС РОЗЬНЯЦЬ І ПАЗЫТЫЎНЫЯ МЭТЫ ЗМАГАНЬНЯ

Змаганьне нерасейскіх народаў з бальшавізмам зьяўляецца толькі прадаўжэньнем іхнага змаганьня за сваё нацыянальнае вызваленьне. Якасна яно нічым ня розьніцца ад дабальшавіцкага пэрыяду. Розьніцы бясспрэчна ёсьць квантытатыўныя, паколькі ступень паняволеньня пры бальшавіцкім рэжыме ёсьць без параўнаньня больш удасканалены й безаглядны, чымсьці ў царскую эпоху, і раўналежна з гэтым зьявіліся й новыя мэтады й шляхі змаганьня. Але сутнасьць і ягоная мэта асталася тая самая. Нерасейскія народы імкнуцца да свайго нацыянальнага вызваленьня й незалежнага дзяржаўнага жыцьця, якое было ім заграбленае фізычнай сілай расейскага імпэрыялізму, раней царскага, а цяпер, пасьля перамогі камуністычнага рэжыму — чырвонага. Нерасейскія народы зусім ня могуць быць зацікаўленымі ў тым, каб ськівуць Сталіна й ягонае палітбюро толькі па тое, каб іхнае месца занялі людзі, што будуць прадаўжаць Сталінскі дэнацыяналізацыйны курс, падтрымліваць культурную адсталасьць і каляніяльную эксплыатацыю ў галіне эканамічнай.

На эміграцыі існуе вялікая колькасьць розных расейскіх палітычных арганізацыяў і партыяў. Яны між сабою розьняцца ня толькі ў мэтадах і тактыцы антыбальшавіцкага змаганьня, але, і то галоўна, у паглядах на будучую перабудову падсавецкага Ўсходу. Але ў вадным — у паглядах на праблему нерасейскіх народаў СССР яны ідэальна згаджаюцца. Адзіная і непадзельная Расея — вось іхны лёзунг, які прысьвечвае ўсім бяз выключэньня расейскім палітычным арганізацыям на эміграцыі. Нутраную структуру гэтай «адзінай і непадзельнай» Расеі, як і развязаньне ў ей нацыянальнай праблемы, у сваіх палітычных праграмах яны на вонкі бачаць па рознаму. Але гэтыя розьніцы — гэта толькі паасобныя варыянты аднэй і тэй самай адзінанедзялімаўскай канцэпцыі.

Як прыклад, возьмем канцэпцыю расейскіх салідарыстых з пад знаку НТС. Паводля салідарыстычнай тэорыі, у дарэвалюцыйнай Расеі, гэтак сама і ў Савецкім Саюзе, ніякага нацыянальнага пытаньня ня было й няма, яно зьяўляецца выдумкай сэпаратыстычна настроенай жменькі інтэлігенцыі. Яны згаджаюцца, што ў Савецкім Саюзе жывуць розныя народы, але, шляхам натуральнага працэсу гістарычнага разьвіцьця, яны твораць сяньня адзіную супольную нацыю — расейскую. Гэтае зьверхняе паняцьце «Расея», «расейскі» задзіночвае — паводля салідарыстычнай тэорыі — усе народы Савецкага Саюзу й родзіць у іх пачуцьцё супольнасьці й адзінства. Гэтая легенда зьяўляецца пакладзенай у васнову палітычнай праграмы НТС, гэткі пагляд абараняў, як дакананы факт, галоўны рэдактар салідарыстычнага воргану «Посев» Е. Раманаў на пашыранай рэдакцыйнай нарадзе гэтага часапісу ў Франкфурце 12—15 верасьня сёлета, а 26 верасьня гэтую легенду паўтарыла ягонымі словамі радыё «Голас Амэрыкі», якое, да рэчы зазначыць, знаходзіцца ў веданьні міністэрства замежных справаў ЗША.

Бальшавікі дзеля замаскаваньня на вонкі сваіх русыфікатарскіх мэтаў высунулі тэорыю «савецкага народу», які яны намагаюцца штучна тварыць на базе расейскае культуры, мовы, расейскага патрыятызму й навет мэсыянізму, іншымі словамі прадаўжаюць і прыспешваюць толькі пад новым шыльдам запачаткаваны царскай Расеяй працэс іхнай прымусовай русыфікацыі. Але расейскія салідарыстыя ахвотна апрабуюць гэты Сталінскі экспэрымэнт. Вось словы аднаго зь сяброў рэдакцыі газэты «Посев» Л. Ржэўскага, сказаныя ім на тэй-жа рэдакцыйнай нарадзе (цытуем за газэтай «Посев» за 21. 9. 1952): «Сьвет савецкі — гэта якраз і ёсьць сучасны расейскі сьвет. Тэрмін ‚савецкі' зьяўляецца ў сутнасьці ня чым іншым, як умоўным абазначэньнем расейскага чалавека, што знаходзіцца пад савецкай уладай. Адсюль вывад — нельга праціўстаўляць ‚сьвет савецкі' — ‚сьвету расейскаму': трэба толькі ўмець знаходзіць, бачыць пад пакрыўкай першага — воблік другога».

Нам скажуць, што гэтак цьвердзяць толькі расейскія салідарыстыя, навет некаторымі расейцамі ўважаныя за арганізацыю з фашыстаўскай ідэалёгіяй, якая, пасьля ўдзелу ў Вісбадэнскай нарадзе, адмовілася далей прыймаць удзел у прыгатаваўчай акцыі дзеля стварэньня супольнага палітычнага цэнтру. Добра, але хай нам пакажуць хоць адну іншую расейскую палітычную арганізацыю, як сярод тых, што прыймаюць удзел у часовай прыгатаваўчай камісыі дзеля стварэньня гэтага цэнтру, так і вонках гэтай камісыі, якая ў сваей практычнай дзейнасьці кіравалася-б іншымі крытэрыямі? Такой палітычнай арганізацыі або партыі сярод расейскіх эмігрантаў ня знойдзеш ізь сьвечкай.

Дык або чым тады астаецца гаварыць і па што ўся гэтая валакіта, якая трывае ўжо больш году над стварэньнем супольнага з расейцамі фронту антыбальшавіцкага змаганьня? Ці-ж можа быць створаная міжнацыянальная арганізацыя, калі людзі, якім тварыць яе даручана, ня могуць знайсьці супольнае мовы даслоўна ў ніводным прынцыповым пытаньні? Ясна, што ў такім асяродзьдзі й пры такіх умовах такая арганізацыя паўстаць ня зможа.

Мы ня выключаем і такой магчымасьці, што можа быць змантаваная супольная з расейцамі арганізацыя й названая супольным цэнтрам антыбальшавіцкага змаганьня (навет без «народаў Расеі» у ейнай назве), але ў запраўднасьці будзе яна толькі фікцыяй і няўдалай пародыяй такога цэнтру, нечым на ўзор Уласаўскага камітэту, створанага ў свой час з ласкі Адольфа Гітлера. Трэба раз назаўсёды сказаць адкрыта, што ў тым асяродзьдзі, дзе ня толькі няма супольных мэтаў дзеяньня, але дзе мэты адных партнэраў супярэчаць мэтам, да якіх імкнуцца другія, ня можа быць ніякага ўзгодненага й скаардынаванага дзеяньня.

У прынцыпе мы ўсё-ж такі ўважаем за патрэбную й карысную супольную з расейцамі антыбальшавіцкую акцыю й ня выключаем магчымасьці стварэньня, але на зусім іншых асновах, супольнага палітычнага цэнтру. Як знайсьці гэтыя іншыя асновы, будзе тэмай аднаго з наступных нашых артыкулаў.

Язэп Каранеўскі

Прывітаньні для Прэзыдэнта БНР

**ЯГО МІЛАСЬЦІ
ПРЭЗЫДЭНТУ РАДЫ БНР
Сп. інж. Мікалаю Абрамчыку.**

Беларуская Моладзь у Францыі вітае Вас з 50-ай гадавінай Вашага нараджэньня й просіць Усемагутнага, каб Вам даў многа здароўя ў гэты важны мамэнт нашага вызвольнага змаганьня. Мы із свайго боку запэўняем, што пакладзём усе свае сілы, каб дапамагчы нашаму гаротнаму народу парваць ланцугі няволі, а калі зайдзе патрэба, дык пойдзем і ўміраць, каб жыла Бацькаўшчына.

Няхай жыве БНР!

**Старшыня Беларускай Незалежніцкай Арганізацыі Моладзі ў Францыі
М. Наўмовіч.
Сакратар: В. Міцкевіч
Парыж, 10. 9. 1952.**

*

**ЯГО МІЛАСЬЦІ
ПРЭЗЫДЭНТУ БНР
Сп. інж. Міколе Абрамчыку.**

Высока Паважаны Спадар Прэзыдэнт!

Беларускае Акадэміцкае Згуртаваньне ў Гішпаніі гэтым мае гонар і асаблівую прыемнасьць пераслаць Вам, з нагоды пацьдзесятых угодкаў Вашага жыцьця, свае найшчырэйшыя пажаданьні плённае працы на карысьць нашае Бацькаўшчыны Беларусі й Беларускага Народу.

Мы моцна верым, што ўжо недалёкі той час, калі, дзякуючы Вашай ахвярнай працы й змаганьню, нашая старонка станецца ўзноў вольнай і незалежнай краінай.

З нашага боку запэўняем Вас, што мы ёсьць заўсёды гатовыя дапамагаць Вам, у чым можам.

Жыве Беларуская Народная Рэспубліка!

**З даручэньня сяброў Беларускага Акадэміцкага Згуртаваньня ў Гішпаніі:
Янка Сурвіла
Мадрыд, 10. 9. 1952 г. Старшыня**

**ЯГО ЭКСЦЭЛЕНЦЫІ
ПРЭЗЫДЭНТУ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКІ
Сп. інж. Мікалаю Абрамчыку.**

Згуртаваньне Беларусаў у Аргентыне, якое задзіночвае ў гэтай краіне ўсю новую, а так-жа й сьвядомую частку старой беларускай эміграцыі ў гэтай краіне, вітае Вас, Спадар Прэзыдэнт, з 50-ай гадавінай Вашага нараджэньня й жадае Вам ад шчырага сэрца доўгага жыцьця й плённай далейшай працы дзеля вызваленьня нашага шматпакутнага народу з расейска-бальшавіцкай няволі. Мы ўпэўненыя, што нашае нацыянальна-вызвольнае змаганьне, якое Вы ачольваеце, мае пад сабой здаровы грунт і найлепшыя пэрспэктывы на будучыню, бо яно апіраецца на непахіснай волі беларускага волялюбнага народу жыць сваім вольным незалежным жыцьцём у собскай незалежнай дзяржаве. Таму раней ці пазьней гэтае змаганьне ўкарануецца поўным посьпехам і ўсе мы пад Вашым кіраўніцтвам яшчэ вернемся пераможнікамі на родныя гоні нашае дарагое Бацькаўшчыны.

Дык няхай жыве Вольная й Незалежная Беларусь!

**Управа Згуртаваньня Беларусаў
у Аргентыне
Буэнос Айрэс, 16. 9. 1952 г.**

*

АД РЭДАКЦЫІ: На адрас сп. Прэзыдэнта Рады БНР было прыслана шмат прывітаньняў у сувязі зь 50-лецьцем Ягонага нараджэньня й ад паасобных беларускіх дзеячоў на эміграцыі, якіх з прычыны нястачы месца ня можам, на жаль, зьмясьціць у нашай газэце.

ПАЗЫЦЫЯ АЙЗЭНГАЎЭРА

(Заканчэньне)

З вышэйшага бачым, што яшчэ рана варажыць аб перамозе Айзэнгаўэра. Ягоныя шансы быць выбраным, якія яшчэ нядаўна выдаваліся бясспрэчнымі, сяньня значна зьменшыліся на карысьць кандыдата дэмакратычнага. Сяньня сьмела можна ўжо гаварыць, што пазыцыі абодвых кандыдатаў, Айзэнгаўэра й Стывэнсона, бадай што аднолькавыя, і аб тым, хто зь іх пасьля 4 лістапада ўвойдзе ў Белы Дом у Вашынгтоне, задэцыдуе далейшы прабег перадвыбарнай кампаніі на працягу наступнага месяца. Сяньня сказаць можна адно: радасьць усіх тых амэрыканцаў і не амэрыканцаў, што жадаюць перамогі Айзэнгаўэра і зьяўляюцца ў ей пэўнымі, ёсьць яшчэ вельмі перадчаснай.

Алесь Крыга

ЯНКА КУПАЛА

Раськіданае Гняздо

ДРАМА У 5-ех АКТАХ

АСОБЫ ВЫСТУПАЮЧЫЯ Ў ДРАМЕ

ЛЯВОН ЗЯБЛІК, пажылы гаспадар, кульгавы, гадоў пад 50.

МАРЫЛЯ, яго жонка, нараклівая, але станаўкая кабеціна, замучаная жыцьцём, худая, гадоў 48.

ДЗЕЦІ ЗЯБЛІКАЎ:

СЫМОН, 24 гады. Дужы й здаровы мужчына, у самым расьцьвеце лет. Горды й адважны. Знае сабе цану і верыць у сваю сілу й моц. Відаць з усяго, што ён трымаў гаспадрку ўсю ў сваіх руках. Зямля для яго ўсім чыста на сьвеце, і за гэту зямлю гатоў пайсьці на самыя страшныя рэчы. Калі з паднятай галавешкай ідзе ў сьвет, кажучы апошнія словы: «па Бацькаўшчыну!», то здаецца, што гэта волат-асілак узьняўся зь зямлі, каб цэлым сьветам здрыгануць.

ЗОСЬКА, 18 г. Кволая дзяўчынка, пранікнутая містычнасьцяй, мэлянхалічная, як-бы ад сьвету гэтага адарваная. Гаворыць часта тое, што і сама добра не разумее, як-бы ў экстазе ці ў поўсьне якім. Любіць яснату й кветкі. Душа ўражлівая, неадгадная. Ня можа пагадзіць акружаючага, будняга й трывожнага жыцьця з сваймі думкамі-снамі напоў дзяцінымі. Носіць беларускую вопратку.

ДАНІЛКА, 14 г. Разумны хлапец не па сваіх гадох, чамусьці лічуць яго скарэй за дурнаватага, чымсьці за разумнага. Цікавіцца ўсім чыста, але часта неўпапад задае пытаньні. Яму ўсе патураюць, мала зварочваючы на яго асобу ўвагі.

АЛЕНКА, 7 г. і ЮРКА, 6 г. Худзенькія, босыя, толькі ў кашульках дзеці. Ува ўсіх актах драмы найбольш нема паміж сабой гуляюць або сьпяць.

*

СТАРАЦ, гадоў пад 70. Абчэпаны торбамі. Відаць, што ўсе яго любяць і шчыра вітаюць. Дабрата і спакой б'е зь яго твару. Крыху згорбіўшыся ад старасьці. Гаворыць проста, бязь лішняе жабрацкае жаласьлівасьці.

ПАНІЧ, гадоў 23, адзеўшыся папанску, ня брыдкі. Відаць, што многа аб сабе думае. Ходзіць з палачкай у руках, якой у часе гутаркі памахавае.

НЕЗНАЁМЫ, гадоў 35. Крэпячы мужчына. Вопратка на ім чорная, крамная. Гаворыць крыху з палачкай, з суважнай павагай, цьвёрда. Верыць у тое, што гаворыць, і ў голасе чутно, што не нагаваравае, а скарэй загадавае. З усяго відаць, што чалавек ён поўны ідэі, у якую сам верыць і якой хацеў-бы каб цэлы сьвет напоўніўся.

ДВОЕ ДВОРНЫХ ЛЮДЗЕЙ.

Рэч дзеецца ў 1905 г. Першы акт у хаце, а рэшта чатыры — на руінах тае-ж самае хаты.

АКТ ПЕРШЫ

Час каля Купальля. Паўдня. Хата Зябліка. Марыла — хворая: то сядзіць, то ляжыць на ложку. Данілка на зямлі скрыпку майструе. Старац, сівы як галуб, абчэпаны торбамі і з кіём у руках, сядзіць на лаве.

ЗЬЯВА I

МАРЫЛЯ — ДАНІЛКА — СТАРАЦ

СТАРАЦ. Так, так пані гаспадыня! Заўсёды бяда бяду вядзе, але ніколі ня трэба здавацца. Ліха перамелецца і ўсё добра будзе. Калісь і мяне ціскалі няшчасьці з усіх бакоў, а цяпер... Э! Што казаць? — Жыву сабе і гора ніякага ня знаю. Торбачкі за плечы, кій сукаваты ў рукі і хаджу сабе як ні ў чым ня бывала па дарожках-пуцявінках. Так, так, пані гаспадыня!

МАРЫЛЯ (гавора з трудом). Гэта-ж толькі падумаць, дзедка. Мала ўсялякага безгалоўя, а тут — на табе яшчэ гэта хвароба. Лета не за гарою, скора касьба пачнецца, жніво, работы гібель, а ты ляжы тут прыкаванай да ложка, як пакутніца якая. Ляпей хай-бы ўжо сьмертачка прыйшла на маю галаву няшчасную, дык хаця-бы хаты не заваліва ла. Ня так я вясну спатыкала і праводзіла, як мне сёлета прыйшлося, ох, ня так, як і сам знаеш! (Кашляе.) А гэты суд у майго з дваром... То-ж не давядзі ты Божанька! Гаспадарку ўсю змарнавалі, да няма нічога дайшлі, і сягоньня ўжо ня ведаеш чалавек, дзе заўтра сонейка прыдзецца сустрэціць. Ох, Божа ты наш справядлівы, за якія грахі цяжкія караеш ты нашу сямейку! Ах, як-жа цяжанька! Падай мне вады, Данілка! (Данілка падае).

ДАНІЛКА. Праўду мамка кажа. Страшэнна нягодна жыць на сьвеце. Вось хоць-бы і мне такая бяда зрабілася: скрыпку старую, што была ў мяне раней, татка із злосьці паламаў, а цяпер і рабі, што хочаш. Пакуль-жа я новую такую змайструю... Ну, але затое калі і зраблю, дык вота-ж зайграю — цэлы сьвет дзіву дасца!

СТАРАЦ. А гдзе-ж гаспадар ваш, пані гаспадыня?

ДАНІЛКА. Тата пайшоў у двор прасіцца, каб яшчэ трохі пачакалі і ня выкідалі нас адгэтуль.

МАРЫЛЯ. Так, так. Сягоньня зыйшоў час наш выехаць, а мой нічога яшчэ сабе ня прыстараўся.

СТАРАЦ. Дрэнна, вельмі дрэнна, калі так выходзе. Свайго ня меўшы — трэба легчы спаць ня еўшы.

ДАНІЛКА. Вось табе дык добра, дзедка: з аднэй хаты выкінуць, дык у другую пойдзеш.

МАРЫЛЯ. Усё-ж да апошняга часу думалі, што за намі зямлю прызнаюць, тым часам наадварот выйшла.

СТАРАЦ. Так, так, пані гаспадыня. Чалавек страляе, а чорт кулю носе.

МАРЫЛЯ. Мой-жа чалавек — каб вы, дзедка, бачылі: за апошні час, як набраў сабе нечага ў галаву, дык проста з розуму зыходзе. Учарнеў, асунуўся, азыс, толькі таўпехаецца з кута ў кут, як сам ня свой. Баюся, дзедка, вельмі баюся, каб зь ім, барані Божа, чаго благога ня сталася.

ЗЬЯВА II

ТЫЯ-Ж і СЫМОН

СЫМОН. (Уходзе з тапаром і кладзе яго за лаву). Ці тата яшчэ не вярнуўся?

МАРЫЛА і ДАНІЛКА. Не, нямашака яшчэ.

СЫМОН. А дзедка ўсё госьціць у нас!

СТАРАЦ. Але, сынку мой. З мамкай тваёй загаварыліся аб справах вашых хатніх. Як уважаю, то ня лёганькі будзеце мець сёлетні гадок.

СЫМОН. Э! Нічога, дзядочак. Пакуль будзе хоць якая малая магчымасьць, то не дадземся жыўцом ваўку ў зубы. Палядзіш!

СТАРАЦ. Сьмела, сынку мой, варожыш. Можа і не дасіся ваўку ў зубы, але жыцьцё бярэ ў свае лапы, ох, як бярэ! Не такія яшчэ дужыя і сьмелыя здаюцца на яго ласку й няласку. Так, так, сынку мой! Адвага наша — адно, а жыцьцё — другое, і найбольш верх бярэ гэта апошняе.

СЫМОН. А мы з татам не папусьцімся, дык што-ж з намі гэта жыцьцё зробе?

СТАРАЦ. Тата ўжо ня дуж твой.

СЫМОН. Ну, то ў мяне сілы хопіць — за яго, за сябе, за ўсіх нас.

СТАРАЦ. Дай Божа, дай Божа, каб табе гэтай сілачкі ставала да канца жыцьця. Бяда толькі, што сіла людзкая не заўсёды на дабро ідзе.

СЫМОН. Я і ня думаю з сваёй сілай у цемнякі ці разбойнікі пайсьці.

СТАРАЦ. Не кажу табе гэтага, сынку мой, але маладасьць сваё права мае. Я сам быў маладым!

МАРЫЛЯ. Нічога яму, дзедка, не ўгаворыш. Ні такой падатлівай натуры ён у мяне ўдаўся. Хоць галавой наложыць, а свайго мусіць дапяць.

ДАНІЛКА. Сымонка, ты па мне пайшоў: і я хоць галавой налажу, а скрыпачку такі зраблю сабе новую!

СЫМОН. Які я ўжо ўдаўся, такі і буду, а свайго ў крыўду не папушчу, хоць-бы там сьвет да гары нагамі перакуліўся. Бяда — часу няма балей гаварыць аб гэтым. Пайду, можа тату сустрэну. Карціць мяне даведацца, што там яму ў двары сказалі.

ЗЬЯВА III

МАРЫЛЯ — ДАНІЛКА — СТАРАЦ

СТАРАЦ. Ох, маці, маці! Высака твой сынок падымацца хоча, але каб нізка часам не зваліўся.

МАРЫЛЯ. Цяжанька мне зь ім якую радачку даць. Змалку дзён такі: як толькі нарадзіўся, дык і то сябе паказаў — грудзей ня прыняў, так, без малака, качаўся. Я тады ў двор за мамку засталася.

СТАРАЦ. Гартаўнейшы і выйшаў ён за тое. А ў двары, кажуць, перамены цяпер вялікія пайшлі.

МАРЫЛЯ. Але, дзедка — перамены. Як вярнуўся малады паніч недзе з далёкага краю, з навукаў, дык усё пайшло ўверх дном — усіх чыншавікоў сталі чысьціць. Не чакае, пакуль суды пакончацца, а наперад за ўсіх заставы кладзе і высяляе; з намі так сама выйшла.

СТАРАЦ. Ведаю, ведаю, пані гаспадыня! Старыя парадкі раськідаюць, а новых, лепшых, нешта ня відаць і ня відаць.

ДАНІЛКА. Як уважаю, то мусіць толькі я адзін новым парадкам на сваёй новай іскрыпачцы зайграю.

«Народы Расеі ня існуюць»

Сёлета летам Папа Пій XII выдаў ведамае «Пасланьне да ўсіх народаў Расеі», якое сярод паняволеных нерасейскіх народаў выклікала зусім зразумелае й апраўданае занепакаеньне і навет пачуцьцё глыбокай крыўды. У той час, калі заходнія палітыкі і дзяржаўныя мужы дзеля сваіх палітычных мяркаваньняў на тэрыторыі аднэй шостай часьці сьвету ня хочаць, апрача расейцаў, бачыць іншых народаў, зразумець іхных натуральных нацыянальных імкненьняў, іх вызнаць і падтрымаць у імя імі-ж прапагаваных дэмакратычных прынцыпаў, дык гэтым яны прыносяць незавіненую крыўду гэтым народам. Але тым больш балючым ёсьць для іх факт, што такую самую пазыцыю заняў і Ватыкан — найвышэйшы маральны аўтарытэт у сьвеце.

Дык і ня дзіва, што палітычныя эміграцыі ўсіх паняволеных расейскім бальшавізмам народаў, як каталікі, гэтак і праваслаўныя, глыбака адчулі гэтую крыўду, якую сваім «Пасланьнем да ўсіх народаў Расеі» зрабіў ім Апостальскі Пасад, і ў сваей прэсе далі гэтаму шырокае выражэньне. Гэтую крыўду ў роўнай меры адчулі й мы, беларусы, тым больш, што сярод нашага народу каля аднэй чацьвертай часьці ёсьць каталіцкага веравызнаньня, а ў ня так далёкай мінуўшчыні і ўвесь наш народ вызнаваў рэлігійную зьверхнасьць Рыму, будучы вуніяцкага веравызнаньня, сілаю потым зьліквідаванага расейскім царызмам. Гэтую крыўду зразумелі й адчулі таксама й прыязныя да нас чужынцы. Гэтак ведамы прыяцель і шчыры абароньнік паняволеных расейскім бальшавізмам народаў старшыня Шкоцкай Лігі за Эўрапэйскую Свабоду Джон Ф. Стуарт зьвярнуўся 27 жніўня сёлета із спэцыяльным пісьмом да Папы Пія XII, у якім у сувязі з гэным «Пасланьнем» бярэ ў вабарону ўсе паняволеныя народы, у тым ліку й беларусаў. Ніжэй перадрукоўваем гэтае пісьмо зь некаторымі скарачэньнямі.

*

Вашая Сьвятасьць!

Дазвольце зьвярнуцца да абвешчанага Вашай Сьвятасьцю Пасланьня да **народаў Расеі. Народы** Расеі ня існуюць; у турме народаў, што называецца СССР, ці дакладней — расейскай імпэрыяй, былі ёсьць расейцы й іншыя народы, што былі й ёсьць ня большымі расейцамі, чымсьці Вашая Сьвятасьць. Мы пэўныя, што Ваш зварот да расейскіх **народаў** і «паўдзённых правінцыяў Расеі», а пад апошнімі Вы бяз сумліву разумелі Украіну, выкліча многа неспакою, турботаў і трывогі між украінцамі, што ёсьць апрычонай 45 мільённай нацыяй, пра што, як здаецца, Вашая Сьвятасьць ня ведае. Вялікая часьціна зь іх ёсьць каталікамі, а рэшта — прыналежныя да праваслаўнай царквы. Але мэтаю іх усіх ёсьць суверэнная і поўная самастойнасьць іхнай краіны й адхіленьне ўсякай залежнасьці ад Расеі, ці царскай, ці сацыялістычнай, ці бальшавіцкай камуністычнай або атэістычнай. Гэта ня ёсьць рэлігійнае, але палітычнае й патрыятычнае пытаньне.

Украіна была вызнана навет Задзіночанымі Нацыямі й атрымала ў іх месца сябры.

Тое самае можна сказаць і пра Беларусь, што вызнаная як апрычоная нацыя й мае сваё месца ў Задзіночаных Нацыях. Беларусы таксама жадаюць скінуць расейскае ярмо, якога роду яно ня было-б. Пасланьне Вашай Сьвятасьці можа быць таксама для іх патрасеньнем, як і для адданых каталіцызму Харваччыны, Славаччыны, Летувы й іншых. Вашая Сьвятасьць гаворыць пра «бліскучыя й гэраічныя чыны» расейцаў у мінулым. Аўтар (гэтага пісьма) пасьвяціўся інтэнсыўным студыям расейскай гісторыі ад часу паяўленьня Расеі на гістарычнай арэне, згодна зь ягонымі ведамасьцямі. Гэтыя «бліскучыя й гэраічныя чыны» выяўляліся на працягу 700 год у бесьперапыннай дзікай агрэсіі, падбоях, масакрах і аграбленьнях слабшых суседзяў. Гэта вельмі страшны сьпісак, не перарываны ані адным праменчыкам сьвятла гуманнасьці. Голад і галіта, пра якія Вы ўспамінаеце, былі на працягу стагодзьдзяў Расеяй падтрымліваныя.

Вашая Сьвятасьць памыляецца, кажучы, што каталіцкая герархія ў Расеі была зьнішчаная; у Расеі каталіцкай герархіі ніколі ня было ў ніякім гістарычным часе і таму яна не магла быць зьнішчанай.

У Расеі была герархія праваслаўнай царквы, што ніколі ў ніякім часе ня вызнавала Рыму й фактычна была яму заўсёды варожай. Рэлігійным галавой царквы быў патрыярх, а галавой фактычным пануючы цар, які кіраваў ей пры помачы пракурора Сьвяцейшага Сыноду, што ў запраўднасьці быў звычайным аддзелам ураду.

Расейскі ўрад ня вызнаваў ад стагодзьдзяў Рыму, бо ён абвяшчаў амбіцыю расейскіх уладароў у разбудаваньні Расеі, як трэйцяга Рыму.

Гэта характарызуе дзею расейскіх уладароў у мінуўшчыні, але аўтар гэтага пісьма можа дадаць таксама сёе-тое із сваей собскай практыкі. У раньніх 30-ых гадох яму было дазволена, у сувязі із прафэсыйнай працай, пабываць у многіх раёнах Расеі далёка ад бітых шляхоў, дзе магчыма ніводнаму чужынцу ад часу рэвалюцыі не пашчасьціла заглянуць. Ён жыў у многіх дамох, з многімі сялянамі так, як і яны — у розных пэрыядах. Ён шмат размаўляў із старэйшымі сялянамі пра рэлігійныя й іншыя справы. Ён таксама хадзіў кажнай нядзелі ў царкву, ён быў у Расеі ў цэрквах, у Маскве, у ваднэй вялікай катэдры далей на Ўсходзе, у многіх цэрквах розных маленькіх мястэчак, цераз якія пераяжджаў. Ён таксама меў нагоду гаварыць тайна ізь сьвятарамі. Але ані аднаго разу не зацеміў ён між гэнымі сьвятарамі або старэйшымі набожнымі сялянамі найменшай азнакі прыхільнасьці для рэлігіі Рыму ці рымскага каталіцызму.

Мы пабойваемся, што чытаньне расейскай гісторыі Вашай Сьвятасьцю й разгляданьне сучаснай сытуацыі ёсьць няправільнае і мы верым, што Вашая Сьвятасць зьменіць Вашае Пасланьне і дасьць надзею іншым паняволеным народам, зь якіх многа, як, прыкладам, летувісы, бадай што ў цэласьці зьяўляюцца каталікамі.

Недамэтным ёсьць прабаваць угаварываць гэныя народы ў тым, што калі эміграпты стануць на Сталінавае месца, то народы гэныя стануцца вольнымі; нерасейцы проста ў гэта ня вераць, бо іхнае дасьветчаньне іх да гэтага ня схіляе.

Аўтар прабыў паважную частку кажнага году ў дзяржавах на заходніх межах СССР і змог адчуць настаўленьне гэтых народаў да Расеі.

Мы зьвярнулі-б Вашую ўвагу на нядаўныя словы першага ў сьвеце аўтарытэту ў пытаньнях Украіны і славян, выдатнага прафэсара славістыкі ў калюмбійскім унівэрсытэце, Клярэнса Мэнінга. Ён сказаў: «Сьвет яшчэ слухае песенькі антыбальшавіцкіх расейцаў. Гэтыя прадстаўнікі кансэрватыўна-вайсковай клясы й сацыял-рэвалюцыянэры з сваімі саюзьнікамі ўважаюць, што Расея ёсьць адна і непадзельная, што ўсе розныя народы, якія знаходзяцца на тэрыторыі, прыналежнай калісьці да расейскай імпэрыі, павінны разглядацца як цэласьць. Хаця відаць, што Сталін баіцца небясьпекі нацыяналізму ў розных народаў СССР, Захад слухае толькі галасоў царыстаў ці керэнскіх, што гавораць якраз працілежнае. Яны вераць, што вольная Расея, толькі ў форме непадзельнай ёсьць адзіна расейская. Для іх нічога не азначае, што Сталін нішчыць цэлыя групы за іх апазыцыю да Расеі. Што ён сьцьвярджае факт, што толькі ад расейцаў маюць савецкія перамогі падтрыманьне. Гэта ўсё не азначае нічога пры параўнаньні із славамі царскіх генэралаў або Керэнскага, што гавораць наадварот».

Мы таксама зьвярнулі-б Вашую ўвагу на важнае інтэрвью, дадзенае амэрыканскаму карэспандэнту Літвінавам каратка перад ягонай сьмерцю, у якім ён падчырківаў, што расейцам ня можна верыць. Так думаюць нерасейскія народы СССР, а яны ведаюць!...

Аўтар стаіць у блізкіх дачыненьнях зь іхнымі правадырамі. Усе гэтыя нерасейскія народы зьяўляюцца асабліва заўзятымі, змагаюцца і ўміраюць — мужчыны, хлопцы, жанчыны й дзяўчаты за сваю справу. Калі Вашая Сьвятасьць не захоча ім дапамагчы ў гэтым, дык я пэўны, што ім Бог дапаможа.

Ваш адданы
Джон Ф. Стуарт

15 год халоднай вайны

Лідар скамунізаваных італьянскіх сацыялістых Пётр Нэнні ў ліпені сёлета быў прыняты Сталінам, а некалькі тыдняў пазьней паявіліся ў амэрыканскай прэсе справаздачы зь ягонай гутаркі з савецкім дыктатарам. Відаць Крэмль уважаў, што вэрсыя гутаркі Сталіна з Нэнні, пададзеная ў амэрыканскай прэсе, ня выклікала чаканага эфэкту, бо нядаўна Нэнні перадаў ангельскаму лейбарыстаўскаму дэпутату Кросману, што інфармацыі амэрыканскай прэсы былі недакладныя, і зьверыўся аб іхным «запраўдным» зьмесьце.

Нэнні асьветчыў Кросману, які нядаўна цэлы тыдзень правёў зь ім разам, што паехаў у Маскву, будучы занепакоеным разьвіцьцём міжнароднай сытуацыі. Ён баяўся, што Саветы ня змогуць справіцца зь перагонкай збраеньняў і што гаспадарскія цяжкасьці могуць іх папхнуць на дарогу небясьпечнай замежнай палітыкі.

Але, як аказалася, Нэнні вярнуўся з Масквы вялікім аптымістым, бо Сталін разьвеіў увесь ягоны страх. Савецкі дыктатар выразіў пагляд, што міжнародная сытуацыя зусім не пагаршылася на працягу апошніх двух год ад часу выбуху карэйскай вайны. Наадварот, ён уважае, што амэрыканскія мэтады вядзеньня вайны выклікалі да іх ненавісьць азыяцкіх народаў і ўзмоцнілі аўтарытэт Савецкага Саюзу на Далёкім Усходзе. Сталін далёкі ад занепакаеньня з прычыны збройных прыгатаўленьняў Атлянтычнага пакту й сказаў, што, хаця лётніцтва зьяўляецца страшным аружжам, але далёка ня вырашаючым у вайне. Дзеля ваеннай перамогі армія аднаго краю павінна акупаваць тэрыторыю праціўніка, а амэрыканцы ня маюць дастатковай колькасьці арміі, якая была-б здольная да наземнай ваеннай акцыі ў шырэйшым маштабе. Далей Сталін і ягонае палітбюро мелі заявіць Нэнні, што яны прыгатаваныя на 10, а навет 15 год халоднай вайны, будучы перакананымі, што савецкі блёк лягчэй ператрывае гаспадарскае напружаньне, чымсьці заходнія дзяржавы. Сталін запэўніў італьянскага палітыка, што Саветы зробяць усё магчымае, каб унікнуць «правакацыйнай акцыі». Сталін заглядаецца сцэптычна на разьбіцьцё Атлянтычнага блёку й загнаньня кліна паміж Вялікабрытаніяй і Амэрыкай. З другога боку, «яму й ня сьніцца ахвяроўваць пладоў ягонае перамогі ў Усходняй Эўропе ў 1945 годзе, каб гэтым уціхамірыць амэрыканцаў».

Ня можа быць ніякага сумліву, што Нэнні быў Масквой выкарыстаны ў якасьці ейнага рупара, каб перадаць заходняму сьвету тое, што хацеў Сталін. Калі-б зьмест гутаркі із Сталінам меў астацца ў сакрэце, дык напэўна Нэнні аб нечым падобным і не загікнуўся-б, ды і Сталін не ўважаў-бы тады за патрэбнае гаварыць аб гэтым з сваім італьянскім прыхільнікам.

Заходняя прэса амаль што аднагодна камэнтуе факт, што Сталіну залежыла на тым, каб Захад паверыў у тое, што ён гаварыў, каб выклікаць на Захадзе сугэстыі мірнай палітыкі Савецкага Саюзу. Бо калі Сталін ня верыць у разьбіцьцё Атлянтычнага блёку дзяржаваў і ў пасварэньне Вялікабрытаніі з Амэрыкай ды й ня думае прадпрыймаць ніякіх крокаў у гэтым кірунку, калі ён уважае, што міжнародная сытуацыя не пагоршылася, калі будзе ўнікаць усякай «правакацыйнай акцыі» і цярпліва чакаць, хоць-бы халодная вайна яшчэ трывала 10 або й 15 год, бо савецкі блёк лягчэй ператрывае гаспадарскія цяжкасьці, чымсьці Захад, дык чаго-ж тады болей трэба заходнім пацыфістым, якія ўвесь час дамагаюцца рэдукцыі збраеньняў? Сталіну ходзіць бясспрэчна пра тое, каб усыпіць насьцярожанасьць Захаду, выклікаць у ім перакананьне, што ніякая небясьпека з боку Савецкага Саюзу не пагражае, зьменшыць інтэнсыўнасьць і разьмеры збраеньняў заходніх дзяржаваў, а ў гэты час рабіць сваю справу.

Р. С.

ЗЬЯВА IV

ТЫЯ-Ж і ЗОСЬКА

ЗОСЬКА. (Уходзе з кветкамі ў руках). А-а! Дзядочак к нам на госьці прыплёўся.

СТАРАЦ. Так, так, мая дачушка! Прыплёўся Божым словам вас пахваліць; зараз далей паплятуся з тым самым.

ЗОСЬКА. (Падсаджаваючыся к старцу). Добра, што я дзедку тут застала: маю просьбу да цябе.

СТАРАЦ. Слухаю, мая дачушка, слухаю. Хэ-хэ-хэ! Думаў, што я толькі ўсё мушу прасіць, ажно, як бачу, то і ў мяне прасіць нечага хочуць. Хэ-хэ-хэ! Яшчэ распанею з гэтакага гонару.

ЗОСЬКА. Дзедка заўсёды жартуе зь мяне, а я толькі буду прасіць таго, чаго ўсе людзі вечна просяць.

ДАНІЛКА. Ну, значыць прапала дзедава панства!

ЗОСЬКА. На, вось табе, дзедачка, кветак трошкі, а ты памаліся ... за здаровейка ...

СТАРАЦ. За чыё, мая дачушка: за татава, матчына, а можа? ...

ЗОСЬКА. (Нахіляючыся к старцу, каб маці і Данілка ня чулі). Памаліся, дзедка, за здароўе нашага паніча.

СТАРАЦ. Добра, дзетачка! Я за ўсіх малюся, за каго толькі просяць — і за жывых і за нябошчыкаў. Толькі вось, што я з тваймі гэтымі кветкамі рабіць буду?

ЗОСЬКА. Як будзеш, дзедка, у цэркаўцы, дык на абразок іх павесь.

ДАНІЛКА. Або к сваёй торбачцы прышпілі, каб харашэй выглядала.

СТАРАЦ. Праўда, сынку мой. Як прыгажэй будзе выглядаць, то можа і кідаць балей будуць.

ЗОСЬКА. Абы толькі не каменьнем, дзедка.

СТАРАЦ. Хэ-хэ-хэ! Усяк бывае, дзеткі мае, усяк! Хто хлебам, хто каменем, а кажны нечым ды кіне. (Зьбіраецца выходзіць).

МАРЫЛЯ. Ужо, дзедка, выходзіць ад нас?

СТАРАЦ. Ужо, пані гаспадыня, ужо! Не сядзіцца мне доўга на адным месцы. І так па капельцы ўсюды гора назьбіраеш чалавечага, ажно несьці цяжанька, а што-ж бы было, каб даўжэй заседжываўся ў ваднэй хаце? Хэ-хэ-хэ! Шчасьліва аставацца! Слава Хрысту!

УСЕ. Слава! Слава! І на векі вякоў.

ЗЬЯВА V

МАРЫЛЯ — ЗОСЬКА — ДАНІЛКА

ЗОСЬКА. (Садзячыся каля маткі на ложку). Мамачка, бачыце, якія прыгожанькія кветачкі?

МАРЫЛЯ. Бачу, бачу, хоць як празь сетку: туман нейкі ў вачох стаіць. Але дзе ты гэта лётаеш? Упынку на цябе нямашака ніякага.

ЗОСЬКА. Не сядзіцца мне, мамачка, у хаце: тут нейк так душна, дык я ўзяла й пабегла на сенажаць. Там хадзіла сабе каля рэчкі і кветачкі для цябе вось гэтыя рвала; ты-ж іх калісь, як здаровая была, так любіла! ... Ах, мамачка, як цяпер хараша на сенажаці! Травіца зелянеецца, кветачкі цьвітуць, ой, як прыгожа цьвітуць! А вольхі над рэчкай так лісточкамі шалясьцяць, так шапацяць, як быццам штосьці дужа цікавае хочуць табе расказаць! Мамка, мамка! Ты здаецца заснула? Ці чуеш, што я табе кажу?

МАРЫЛЯ. Чую, міленькая, чую, хоць у вушох шуміць, як у млыне якім.

ЗОСЬКА. Сонейка яснае сьвеціць і грэе, ах, як сонейка грэе і сьвеціць! А птушачкі пяюць аж заліваюцца! Так цёпла, так прыгожа на сьвеце! Мамка, а як табе?

МАРЫЛЯ. Мне, дзеткі, халодна і жудка.

ЗОСЬКА. Не гаварэце так, мамка, а то і мне робіцца халодна і жудка ад тваіх слоў ... Ага! Нарвала, значыцца, я табе кветачкаў, падыйшла к рэчцы, нагнулася і гляджуся ў вадзіцу, як у люстэрку, як раз я другая там адсьвечаваюся. Загледзелася гэтак, аж нехта хапель мяне ў пояс. Я ў крык, вырывацца, гляджу, аж гэта паніч з двара. І так стаў абыймаць мяне і цалаваць! Я стузянулася раз, другі і вырвалася. Але які ён прыгожанькі, каб мамка бачыла!

МАРЫЛЯ. Ведама, паніч! (У бок). Сваймі грудзьмі, што і яе, выкарміла, а ён ... (Да Зоські). Не займайся вельмі зь ім, дачушка.

ЗОСЬКА. Я-ж нічога, мамачка. (Паўза). Ах, каб ведала, мамка, які я сон сягоньня сьніла?! Хочаш, дык я раскажу.

ДАНІЛКА. Раскажы, Зоська, раскажы! Бо і я-ж люблю вельмі сны сьніць. Толькі пачакай — я малых паклічу, хай і яны паслухаюць. (Выходзіць і цераз часіну варочаецца з Аленкай і Юркам).

ЗЬЯВА VI

ТЫЯ-Ж і АЛЕНКА зь ЮРКАМ

ДАНІЛКА. (Да Аленкі й Юркі). Ну, садзецеся, малыя! Толькі ціха будзьце! Зоська сон будзе расказаваць. (Аленка й Юрка садзяцца на землі каля матчынага ложка). Ну, пачынай, Зоська! Мы гатовы!

ЗОСЬКА. Здаецца прыйшоў да нас у хату нехта такі нязвычайны — на галаве месяц, у руццэ сонца трымае: прыйшоў ён і кажа: „Годзе вам тут сядзець, годзе гібець, хадзеце за мной!" Мы спачатку, здаецца, перапужаліся, а пасьля нічога. Ён так добра на нас паглядаў, як быццам у вачох яго сьлёзы засьвяціліся. Сабраліся мы ўсе — ты, тата, я, Сымон, Данілка і малыя, ды пайшлі гэтак за ім, кінуўшы і хату і гаспадарку ўсю сваю. Як толькі мы выйшлі — ён і кажа: „Што-б там перад вамі ці за вамі не рабілася — не аглядавайцеся назад, а йдзеце за мной усё наперад, усё наперад!" Ішлі мы гэтак, ішлі, ажно бачым — нейкае кругом нас страшэннае балота: гадзіны, вужакі, сьліўні так і капашаць, як у гаршку якім ...

ДАНІЛКА. Ай-я-я! Вужакі й сьліўні?!

ЗОСЬКА. Але нас крануць баяцца: ён усё іх сонцам адстрашавае, — толькі сыкаюць і выкручаваюцца. Мінулі мы гэта балота вужачае, ідзём, — ажно ўвайшлі мы ў цёмны цямнюсенькі, дзікі лес. Вецер у галінах трашчыць і сьвішча, зьвяр'ё ўсялякае вые, зубамі ляскоча, на нас кідаецца ...

ДАНІЛКА. Божухна! Зьвяр'ё ўсялякае. Вось жудасьць! Я, мусіць, памёр-бы там із страху.

ЗОСЬКА. Але крануць ня сьмеюць — ён іх, як вужак, усё сонцам адганяе. Перайшлі мы гэты зьвярыны лес, ідзём — ажно ўсходзім на вялікае-вялікае поле пяшчанае — віхор толькі арэ ды барануе, ды толькі дзе-нядзе на полі гэтым тырчаць пасохшыя вольхі, вербы, асіны. Па гэтым дзярэўі — з аднаго на другое — пералятаюць птушкі нейкія чорныя, такія страшныя, жудасна і сказаць! Да нас падлятаюць, распускаюць капцюры, разьзяўліваюць глюгі, — здаецца разьдзерці і глынуць нас хочуць.

ДАНІЛКА. Ах, як страшна! Балазе, што хоць мяне ня глынулі.

ЗОСЬКА. Але нічога: яго — нашага павадыра — і сонца баяцца. Мінулі гэта поле птушынае, ідзём. Нарэшце затрымаліся ў тым месцы, дзе вясёлка спускаецца. Тут ён ізноў так кажа: „Ідзеце за мной сьледам па гэтай шматкалёрнай дарожцы". Мы ўзьдзівіліся, але што ты зробіш? — пайшлі. І падымаемся што раз выжэй, выжэй, мінулі хмары, вобалакі, аж да самых зорак забраліся, а там, па млечнай пуціне, з зоркі на зорку пераскаківаючы, цягнёмся далей; а зоркі хоць сьвецяцца, але не пякуцца: як па кветачках гэтых ступаем па іх ...

ДАНІЛКА. А ў ногі не калоліся гэныя зоркі?

ЗОСЬКА. І прыйшлі мы ў нейкую краіну, якой я ў жыцьці ня бачыла, ня чула і ня сьніла. Зіхацістыя кветкі скрозь рассыпаны, як тыя зоркі, што мы йшлі па іх; сады нейкія нянаскія так цьвітуць, так цьвітуць, куды прыгажэй, як нашы вішні ды яблыны! На гэтых садох калышуцца птушкі райскія — пер'е іх, як брылянтамі ўсыпана і дыямэнтамі; а пяюць яны — мільён салавейкаў нашых так не патрапе. У садох па далінках рэчкі бягуць, а вадзіца так пераліваецца, як-бы сонца ў тых шкелках, што мы бачылі пры падсьвечніках у цэркаўцы! ... Ідзём гэтым садам-раем, ды ідзём, ажно калі палядзім! ... Стаіць палац відам ня віданы, слыхам ня слыханы: увесь зіхаціць, як-бы з самага сонца быў зроблены — сьцены залатыя-залатыя, а страха бліскучымі маланкамі пакрыта. Увайшлі мы ў гэны палац, азіраемся навокал, і што-ж? — На самым пачэсным месцы сядзіць сьвяты Спас, а каля яго Матка Боская, сьвяты Юр'я, Мікола і Ільля!

ДАНІЛКА. Навет Ільля і Мікола! Вось дык дзіва!

ЗОСЬКА. І шмат, шмат усялякіх сьвятых меншых і большых. Падыйшлі мы к Спасу, а ён, добранькі, і кажа: — „Годзе вам на зямлі пакутаваць, прыйшла ўжо пара із мной вам разам панаваць! Сьвяты Пётра, — тут паказаў ён на гэнага, што нас вёў — будзе над вамі апекумець на векі вечныя"... (Паўза).

ДАНІЛКА. Ну, а далей, што было?

ЗОСЬКА. Нічога! Тут я прабудзілася.

ДАНІЛКА. Шкода, што мы там не асталіся. Там-бы можа і скрыпку памаглі скарэй зрабіць.

ЗОСЬКА. Мамка, ці ты ўсё чула? Ну, як па твойму: добры сон ці не?

МАРЫЛЯ. Чаму ня чула. Добры сон, вельмі добры сон! Бог яшчэ на нас, як відаць, не забыўся, а я думала ...

ЗОСЬКА. Вось і тата ідзе. (Уходзе Лявон і садзіцца за сталом. Аленка і Юрка выходзяць).

(Далей будзе)

Згуртаваньне Беларусаў у Монтрэалі

Расьцярушаная амаль па ўсім сьвеце беларуская эміграцыя ў тэй ці іншай форме стараецца захаваць свае традыцыі. Пераважна ўва ўсіх большых гарадох дэмакратычнага сьвету шмат ужо чулася аб яе дзейнасьці.

Так вось і ў Монтрэалі, адным із большых гарадоў Канады, знайшлі сабе прытулак сотні палітычных уцекачоў, сярод якіх ня мала сьведамых і адданых беларускай нацыянальна-вызвольнай справе працаўнікоў.

16 верасьня мінулага году ініцыятыўнай групай, папоўненай новапрыбылымі суродзічамі з Эўропы, склікаецца першы агульны сход беларусаў, пражываючых у гэтым горадзе. З прыемнасьцю можна было пачуць гарачыя дыскусыі над праблемай стварэньня сваей нацыянальнай арганізацыі. Магчыма, што толькі гледзячы на амаль аднолькавы інтэлектуальны ўзровень прысутных і аднолькавыя інтэнцыі — стварыць сваю арганізацыю, сход праходзіць у вельмі згодным, прыязным і сяброўскай атмасфэры. На ім пастанаўляецца: 1. назваць арганізацыю «Згуртаваньнем Беларусаў у Монтрэалі»; 2. надаць ей абсалютна апартыйны характар; 3. праводзіць працу выключна ў культурна-асьветнай галіне з мэтаю захаваньня беларускіх нацыянальных традыцыяў і рэпрэзэнтаваць беларускае імя навонкі.

Выбіраецца часовая ўправа, заданьнем якое зьяўляецца прапагаваньне арганізацыі й апрацаваньне пляну працы на вызначны адрэзак часу. Актыў апраўдае сябе, добра вывязваючыся з гэтага заданьня, і ўжо 2-га сьнежня арганізуецца ўрачыстае сьвяткаваньне гераічнага Слуцкага Паўстаньня. У гэтым часе пачынае сваю працу культурна-мастацкі гуртох пад кіраўніцтвам сп. Чопчыца. Рыхтуецца праграма першага беларускага канцэрту.

З пачаткам бягучага году зьбіраецца агульны сход сяброў, дзе канчаткова апрацоўваецца статут арганізацыі й выбіраецца ўправа на працяг аднаго году. У склад управы ўваходзяць: старшыня — сп. В. Ждан, сакратар — сп. Я. Кузьміч, фінансавы рэфэрэнт — сп. Б. Валадзімер, арганізацыйны рэфэрэнт —сп. А. Монід, культурна-асьветны рэфэрэнт — сп. Чопчыц. Кантрольная Рада: старшыня — сп. М. Паўловіч, сябры — сп. сп. М. Чэша і В. Мірановіч.

З рэпрэзэнтацыйнымі мэтамі ладзіцца 9-га сакавіка першы беларускі канцэрт у Монтрэалі, водгукі аб якім знаходзяць месца і сярод іншых нацыянальнасьцяў. Гэта дае нам яшчэ больш энтузыязму, у выніку чаго пачалі прыбываць новыя сябры, а зь імі й новыя сілы.

Вялікае нацыянальнае сьвята беларускага народу дзень 25 Сакавіка адзначаецца ўрачыста з прысутнасьцю гасьцей ад Украінскага Нацыянальнага Аб'еднаньня. Пасьля сьвяточнага рэфэрату, прачытанага старшынёй Згуртаваньня, выступіў з прывітаньнем прадстаўнік ад УНА. Далейшая частка праграмы выпаўняецца сьпевамі мяшанага хору й дэкламацыямі.

Умовы, у якіх прыходзіцца працаваць, выклікаюць неабходнасьць мець собскі куток, дзе-б рэгулярна праводзіліся сходы, розныя заняткі й дзе наагул магло-б разьвівацца нармальнае арганізацыйнае жыцьцё. Таму прыкладаецца ўсе сілы да гэтага і ў хуткім часе знаходзіцца адпаведнае памяшчэньне. З пачаткам травеня пачынаецца ўжо праца ў нанятай залі. Шмат працы ўкладаецца ў тое, каб прывесьці яе ў належны выгляд. Актыўны ўдзел бяруць беларусы ў Монтрэалі ў пратэстацыйным мітынгу паняволеных народаў, які адбыўся 15 чэрвеня сёлета. Сярод некалькі тысячаў маніфэстантаў ёсьць ладная колькасьць і нашых суродзічаў. Яны карыстаюцца з гэтай нагоды, каб яшчэ раз падчыркнуць сваю ненавісьць да крывавага акупанта нашай бацькаўшчыны. На мітынгу ад імя ЗБМ прамаўляе сам старшыня Згуртаваньня. Мясцовая прэса шырока насьвятліла прабег маніфэстацыі, а ў ейных справаздачах упрашыню было ўспомненае й нашае нацыянальнае імя.

Культурна-мастацкі гуртох хутка падгатаваў праграму й зладзіў канцэрт, які ўжо быў другім нашым паважнейшым выступленьнем. На канцэрце гэтым прысутнасьць гледачоў значна большая, чымсьці на першым. Камэдыя К. Каганца «Модны шляхцюк», п'еска Ф. Аляхновіча «На вёсцы», мастацкі мантаж сп. Чопчыца «Вечар на вёсцы», а пасьля «Лявоніха» ў выкананьні чатырох параў моладзі, — усё гэта ацэньваецца прысутнымі бурнымі авацыямі.

Назаўтрае, 22-га чэрвеня ўрачыста згодна беларускіх традыцыяў адбываецца высьвячэньне сьвятліцы. Рана адпраўляецца Божая Служба запрошаным з Торонто беларускім сьвятаром, які ў сваім казаньні заклікаў да любові й веры ў Усявышняга. Гарачыя малітвы ў роднай мове многія з нас змаглі пачуць упршыню на эміграцыі. Супольны сяброўскі абед, прыгатаваны Жаноцкім Таварыствам, а пасьля агульная вечарына закончылі гэты ўрачысты дзень.

Такім чынам заканчваецца вясенны сэзон. На лета астаюцца супольныя пікнікі. Амаль кажнай нядзелі групова выяжджаем на бераг ракі Сьв. Лаўрэнта, дзе праводзіцца час за сяброўскімі й спартовымі гульнямі. У гэты час праводзіць сваю трэніроўку футбольная дружына «Прыпяць», якая ў наступным сэзоне мае ўступіць у гарадзкую лігу. Ня гледзячы на вялікую далячыню, сябры арганізуюць паездку на Нягарскі вадапад, дзе зь ініцыятывы Саюзу Беларускае Моладзі ў ЗША адбываецца спатканьне беларусаў ЗША зь беларусамі з Канады.

За час летняга сэзону сіламі Згуртаваньня выдаюцца й пашыраюцца «Загубленае Жыцьцё» — драма ў трох дзеях Т. Лебеды, «Зьблнтэжаны Саўка» — жарт у аднэй дзеі Л. Родзевіча й прыгатаўляюцца да выданьня іншыя сцэнічныя творы.

1-га верасьня пачынаецца асенньі сэзон. Пачынае працу вячэрняя школа для дзяцей, у якой стараемся навучыць беларускіх дзетак роднае мовы й прывіць ім любоў да сваей бацькаўшчыны. Для дарослых арганізуюцца лекцыі зь беларусаведы. Пачынае рэгулярна сваю працу тэатральная студыя пад кіраўніцтвам слаўнага знатака мастацтва сп Рамара. 17 студэнтаў з зацікаўленьнем пазнаюць штуку мастацтва ня толькі тэарэтычна, але й практычна шляхам апрацоўваньня эцюдаў. Пры гэтым прыгатаўляецца матэрыял для новага канцэрту.

Вось гэткім спосабам Згуртаваньне Беларусаў у Монтрэалі правяло год свайго арганізацыйнага й сяброўскага жыцьця. Што праўда, шмат хваліцца няма чым, адная было-б вельмі пажаданым, каб хаця ў такой меры пайшлі гэткай дарогай іншыя, якія, заграсшы ў палітычных спрэчках, не здаюць сабе справы з таго, што іменна культурна-асьветнай працай мы больш спрычыніемся для нашай нацыянальна-вызвольнай справы.

В. Ждан
Сябра Згуртаваньня Беларусаў у Монтрэалі.

Гасьціннасьць захавалася

(Пісьмо з Ангельшчыны)

Ня гледзячы на тое, што беларуская эміграцыя ўжо ад даўжэйшага часу зьяўляецца моцна расьцярушанай па ўсіх дзяржавах заходня-дэмакратычнага сьвету, яна ніколі не забываецца сваей традыцыйнай гасьціннасьці й адведваньняў. Гэтта, хачу, як прыклад навашых традыцыйных гасьціннасьці, адцеміць прыязьнь двух даволі вялікіх асяродзьдзяў Згуртаваньня Беларусаў у Вялікабрытаніі — у Брадфордзе й Манчэстары.

Калі беларусы ў Брадфорд адзначалі гадавіну куплі й адкрыцьця Беларускага Дому ў Брадфорд, дык запрасілі на гэтую ўрачыстасьць і беларусаў з Манчэстару, а пазьней гэтыя апошнія запрасілі нас з Брадфорду да сябе. Так як мне прышлося аднаму зь іх быць гасьцём у Манчэстары, дык пастараюся тут апісаць свае ўражаньні з гэтых адведзінаў.

Дня 20 верасьня сёлета ў горадзе туману й дыму — Манчэстары адбылася міжнацыянальная вечарына, ладжаная Каардынацыйным Камітэтам Уцекачоў з Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы. Да гэтага Камітэту належаць і беларусы ў Манчэстары. Калі я ўвайшоў у сярэдзіну залі, дзе адбывалася вечарына, дык узапраўды мушу адцеміць прыемнае ўражаньне, якое зрабіла на мне прыгожа ўдэкараваная нацыянальнымі сьцягамі заля. Адразу можна было здагадацца, што беларусы прылажылі адпаведныя стараньні, бо беларускі белчырвона-белы сьцяг быў найвыразьней з усіх відаць і выдзяляўся паміж сьцягамі летувіскім, латыскім, польскім і украінскім.

Назаўтрае, г. зн. 21 верасьня, у Манчэстарскім клюбе ЗБВБ адбылася Божая Служба, якую адправіў а. Аляксандар Крыт — сьвятар БАПЦ на Вялікабрытанію, які таксама сумесна з намі прыехаў з Брадфорду.

Пасьля Божай Службы а. Аляксандар прачытаў прысутным, якіх была вялікая колькасьць, рэфэрат на тэму «Беларуская Праваслаўная Аўтакефальная Царква ў мінуўшыні й ейнае адраджэньне». Рэфэрат быў вельмі зьмястоўны й прынёс шмат карысьці прысутным, аб чым сьветчылі многія запытаньні да прэлегэнта й ажыўленая дыскусія.

Сп. А. Лашук, які прыехаў зь Лёндану, паінфармаваў прысутных пра ўмовы разьвіцьця нашае прэсы й заклікаў да ўрэгуляваньня за яе залегласьцяў, а таксама зьвярнуўся з просьбай, каб ні нішчыць прачытаных газэтаў, а перасылаць іх тым беларусам, што ня маюць магчымасьці іх выпісваць або рассылаць дзеля прыдбаньня новых падпішчыкаў.

Яшчэ хачу паінфармаваць, як выглядае беларускі клюб ЗБВБ у Манчэстары. Ён месьціцца ў прыватным доме аднаго зь беларусаў — сп. Кастуся Варэніка, які з добрае волі ахвотна адпусьціў два пакоі для карыстаньня клюбам, даючы гэтым прыгожы й варты насьлядаваньня прыклад патрыятычнай ахвярнасьці. Калі ўвойдзеш у сярэдзіну клюбу, дык атрымліваецца ўзапраўды прыемнае ўражаньне. У вадным, прыгожа ўдэкараваным пакоі месьціцца чытальня й бібліятэка, а ў другім, большым адбываюцца Багаслужбы й робіцца розныя зборкі й сьвяткаваньні нацыянальных сьвятаў. У чытальні заўважаю на сьценах партрэты нашых дзеячоў, паэтаў і пісьменьнікаў. Тут-жа й фотоздымкі ўсіх важнейшых падзеяў зь беларускага жыцьця ў Вялікабрытаніі.

З прыемнасьцю можна зазначыць, што беларусы ў Манчэстары, зарганізаваныя ў ЗБВБ і ЗБК, вядуць актыўную нацыянальную дзейнасьць. Астаецца толькі шчыра ім за гэтага падзякаваць і пажадаць далейшых посьпехаў у працы.

Брадфорд, 22. 9. 1952 г.

Янка Крушына

Новая праца аб Крыме

Нядаўна выйшла з друку вялікая й грунтоўная, абапёртая на шматлікіх дакумэнтах і аўтэнтычных фактах, праца ў нямецкай мове Эдыге Кірымаля п. н. «Нацыянальнае змаганьне крымскіх туркаў». Аўтар дае гістарычны агляд нацыянальнага адраджэньня Крыму, кладучы асаблівы націск на пэрыяд 1917—1918 гадоў, калі ў Крыме разгарэлася магутным полымем змаганьне за дзяржаўную незалежнасьць, якое ўкаранавалася абвешчаньнем дзяржаўнай незалежнасьці й стварэньнем крымскай дзяржавы ў 1918 годзе, зьнішчанай потым фізычнай сілай расейскага бальшавізму.

Наступныя разьдзелы кнігі прысьвечаныя нацыянальнаму змаганьню Крыму пад савецкай акупацыяй і падчас апошняй сусьветнай вайны. Кніга заканчваецца панурым разьдзелам аб ліквідацыі бальшавікамі крымскай аўтаномнай рэспублікі й прымусовым выселеньні крымскага насельніцтва.

Кніга Кірымаля зьяўляецца найсаліднейшай мадэрнай навуковай працай аб нацыянальна-вызвольным змаганьні Крыму й зь ей карысна пазнаёміцца інтэлігенцыі кажнага паняволенага расейскім бальшавізмам народу.

(Ст.)

Недастойныя дапамогі

Існуе амэрыканская арганізацыя дапамогі для ўцекачоў з за зялезнай заслоны, ведамая пад назвай «ПЭП» (праграма прэзыдэнта для ўцекачоў). Ад нядаўнага часу гэтая арганізацыя перастала аказваць дапамогу тым палітычным эмігрантам, якія ўцякаюць з Югаславіі. Уцёкі зь дзяржавы Ціты больш не ўважаюцца гэтай арганізацыяй за палітычна ўматываваныя, а Югаславія з варожай сталася прыязнай дзяржавай.

Кансэквэнцыі такой амэрыканскай пастановы зьяўляюцца для многіх вельмі трагічныя. Прыкладам у Трыесьце ажроіцца ад уцекачоў зь Югаславіі, якія ня могуць эміграваць далей, а назад у сваю бацькаўшчыну вярнуцца ня хочуць. Сотні адзінокіх мужчын зьяўляюцца памешчанымі ў будынку аднае турмы, якая з санітарных прычынаў не ўважаецца болей прыгоднай для крымінальных праступнікаў. Гэтак выглядае брама, праз якую мусяць прайсьці людзі, каб трапіць у свабодны сьвет. Ня гледзячы на такое прыйімо, вельмі малая іх колькасьць вяртаецца назад.

У СПРАВЕ ВЫПІСВАНЬНЯ ГРАМАФОННЫХ ПЛІТАК

Гэтым падаецца да ведама, што выпісваць беларускія грамафонныя пліткі, выдадзеныя Цэнтраляй Беларускіх Акадэміцкіх Арганізацыяў на чужыне, трэба паводля наступнага адрасу:
U. Butrymovic, 19, Place Hoover, Louvain, Belgique.

БЕЛАРУСЫ У АРГЕНТЫНЕ

Пасьля месячнага перапынку грамадзкага й палітычнага жыцьця ў Аргентыне, які быў выкліканы нечаканай сьмерцю Эвы Пэрон, ізноў ажывілася дзейнасьць Згуртаваньня Беларусаў у Аргентыне.

З тае нагоды, што ў Аргентыне ўсе абходзяць урачысты Дзень Вясны, які прыпадае на 21 верасьня й адначасна зьяўляецца Днём Моладзі, Управа Згуртаваньня Беларусаў у Аргентыне ладзіла 20 верасьня сяброўскую вечарыну ў памяшчэньні Армянскага залі.

Ня гледзячы на тое, што ад самага раньня йшоў дождж і не заносілася на добрую пагоду, аднак сабралася вялікая колькасьць моладзі разам із старэйшымі, каб спаткаць «тутэйшую вясну» й супольна правесьці вечар. Між іншым, на залі можна было пабачыць значную колькасьць сем'яў із старэйшай эміграцыі, якая пачала жыва цікавіцца дзейнасьцю нашай арганізацыі. На ўвагу заслугоўвала актыўнасьць у абслугоўваньні гасьцей вучаніцы Марты Ількевіч, дачкі старых эмігрантаў, сьведамых беларусаў, якія прыбылі зь ей на вечар. Вечар прайшоў у прыемным сяброўскім настроі, а моладзь і старэйшыя змаглі павесяліцца пад гукі аркестры «Багэмія», якая зарганізаваная кіраваная двума братамі сп. сп. Скіпорамі. Даход зь вечару быў прызначаны на папаўненьне касы нашай арганізацыі.

К. Мацкевіч

Беларусы у Брадфордзе

Беларуская калёнія ў вакрузе Ёркшыр (Ангельшчына) урачыста адзначыла 13 верасьня сёлета гадавіну адкрыцьця Беларускага Дому ў Брадфордзе, у якім канцэнтруецца ўсё арганізаванае нацыянальнае жыцьцё нашых суродзічаў гэтага гораду й акругі. Наагул трэба адцеміць, што беларуская калёнія гэтае акругі зьяўляецца аднэй з найлепей зарганізаваных і дзейных у Вялікабрытаніі, а набыцьцё год таму назад собскага грамадзкага дому зьяўляецца вымоўным доказам ахвярнасьці ейных сяброў.



На ілюстрацыі зь лева на права: Я. Калбаса — старшыня управы Згуртаваньня Беларускіх Камбатантаў дружыны «Ёркшыр» у Брадфордзе, а. Аляксандар Крыт — адміністратар Беларускага Дому, А. Фісэнка — сябра Згуртаваньня Беларусаў у Вялікабрытаніі й Я. Міхалюк — заступнік старшыні ўправы Згуртаваньня Беларусаў у Вялікабрытаніі.

НОВЫ ПРЭЗЫДЭНТ ШКОЦКАЙ ЛІГІ ЗА СВАБОДУ ЭЎРОПЫ

Прэзыдэнтам Шкоцкай Лігі за Свабоду Эўропы выбраны цяпер — на месца дасюлешняга прэзыдэнта лёрда Мэнсфільда — былы шэф імпэрыяльнага брытанскага штабу падчас другой сусьветнай вайны і фэльдмаршал лёрд Айронсайд. Вялікі прыяцель паняволеных бальшавізмам народаў Джон Ф. Стуарт астаецца й надалей старшынёю выканаўчага камітэту Лігі.

Супраць кінофільму «Ромэль». У Вене нядаўна адбылася крывавая вулічная бойка, якую выклікалі камуністыя, дэманструючы супраць амэрыканскага кінофільму «Ромэль — ліс пустыні», які высьветляўся ў вадным венскім кінатэатры. Камуністыя закідаюць, што фільм, выстаўлены Ромэля ў дадатнім сьвятле, гэтым самым апотэазуе гітлерызм. У выніку бойкі было звыш 100 чалавек параненых, 74 зь іх паліцыянты. Апошнім часам і ў Зальцбургу гэты фільм быў перадчасна зьняты з праграмы.

Прадстаўніцтвы „Бацькаўшчыны“

ПАЗА НЯМЕЧЧЫНАЙ:

1. **У Бэльгіі:**
Mr. Karas Leonid, 19, Place Hoover, Louvain, Belgique.
2. **У Ангельшчыне:**
The Whiteruthenian Editorial Foundation 52, Penn Road, London, N. 7. England.
3. **У Францыі:**
Mr. Symaniec Vladimir, 15, rue du Ltn. Boncour, Neuilly s/Seine, France.
4. **У ЗША:**
Mr. B. Danilovich,
222 Suydam St. New Brunswick, N. J. U.S.A.
5. **У Канадзе:**
Mr. Joseph Corny, 270 Clinton Str. Toronto, Ont., Canada.
6. **У Аргентыне:**
Asociacion Bielorusa en la Argentina calle Coronel Sayos 2981, 4 de Junio prov. Buenos Aires. Argentina.
7. **У Аўстраліі:**
Mr. Jackievic Donat, 60 Fisher Street East Brisbane, Q-ld, Australia.
8. **У Вэнэцуэлі:**
Dudzickj Vladimir, Crucesita a San Miquel 74, Caracas, Venezuela.
9. **У Новай Зэляндыі:**
Mr. Karanieuski Marian, R. N. Z. A. F. Station Taieri. Otago. New Zeeland.

З прычыны дэвізовых абмежаваньняў у Нямеччыне грошы за «Бацькаўшчыну» з усіх краінаў паза Нямеччынай просім перасылаць на наступны адрас:
Paul Urban
19, Place Hoover, Louvain, Belgique.

ПАПРАЎКА

У папярэднім нумары «Бацькаўшчыны», у артыкуле «Радаснае й шчасьлівае жыцьцё», як тэрмін цяперашняй савецкай пяцігодкі, замест 1951-1955 г.г., было з прычыны карэктарскага недагляду пададзена — 1951-1952 г.г.